Веcткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: ***www.baza-belarus.org, e-krama.com***
Электронны адрас: ***viestki@mail.com***
✉ ***P. O. Box 572, New York, NY 10313***

№ 1 (563)
Студзень 2013 г.

Мітынг падтрымкі беларускай дэмапазыцыі

У сераду 19 сьнежня 2012 году каля штаб-кватэры ААН на Мангэтане прайшоў мітынг, ладжаны Беларуска-Амэрыканскім Згуртаваньнем "Пагоня". Мітынг быў прымеркаваны да другой гадавіны драматычных падзеяў 19 сьнежня 2010 году ў Менску, і праводзіўся ў падтрымку палітзьняволеных і дэмакратычнай нацыянальнай апазыцыі, у знак пратэсту супраць працягу рэпрэсіяў і перасьледу ў Беларусі.

Як ведаем, у 2010 годзе, адразу пасьля завяршэньня прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі, на вуліцы Менску выйшлі тысячы людзей, каб пратэставаць супраць шматлікіх парушэньняў і сваволі рэжыму Лукашэнкі, які замест свабоднага волевыяўленьня народу стварыў атмасфэру страху і ўціску і, па сьведчаньнях шматлікіх незалежных экспэртаў, дапусьціў фальшаваньне вынікаў выбараў. Каля Дому Ўраду ў Менску дэманстранты спадзяваліся на дыялёг з уладамі, але ў выніку сотні людзей былі арыштаваныя, і сярод іх апынуліся таксама сем зь дзесяці кандыдатаў у прэзыдэнты – такі сумны вынік цягне хіба на сусьветны рэкорд Гінэса.

За мінулыя два гады частка асуджаных тады людзей апынулася на свабодзе, але рэжым увесь час працягвае практыку беззаконьня й сваволі, калі за палітычны пратэст людзей караюць як крымінальнікаў, цынічна закідаючы ім такія злачынствы й парушэньні як хуліганства, зьбіцьцё міліцыянтаў і нецэнзурную лаянку, сьведкамі якіх выступаюць з фальшывымі сьведчаньнямі самыя міліцыянты, што праводзілі арышты. За кратамі застаюцца палітвязьні Мікола Статкевіч, Павал Севярынец, Алесь Бяляцкі, Зьміцер Дашкевіч ды шмат іншых, а турмы папаўняюцца ўсё новымі палітвязьнямі.

Менавіта таму Згуртаваньне "Пагоня" вырашыла адзначыць сумную гадавіну і выказаць падтрымку палітзьняволеным і заявіць свой пратэст супраць парушэньня правоў чалавека і дэмакратычных свабодаў у Беларусі.

На мітынг сабралася моладзь ня толькі зь Нью-Ёрку, але і зь іншых штатаў. Мітынг адкрыў старшыня "Пагоні" сп. Віталь Зайка, які коратка распавёў пра мэты мітынгу і пра падзеі 19 сьнежня 2010 году. Затым прысутныя скандавалі лёзунгі "Беларусь – Так! Лукашэнка – Не!", "Далоў Лукашэнку!", "Жыве Беларусь!". Пад сонцам на сьвежым ветры лунаді бел-чырвона-белыя сьцягі, мінакам тлумачыліся прычыны, чаму моладзь выйшла на мітынг.

Карыстаючыся нагодай, сп. Зайка зьвярнуўся да прысутных з заклікам узмацняць салідарнасьць беларусаў у Амэрыцы, каб знаходзячыся за тысячы міляў ад Беларусі, быць здольнымі дапамагчы і Бацькаўшчыне, і самым сабе.

Напрыканцы акцыі прагучэў Беларускі нацыянальны гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі".

Віталь ЗАЙКА

Здымак В. Зайкі

Сьнежаньскі сход Згуртаваньня “Пагоня”

У суботу 8-га сьнежня ў Міжнародным Доме Маракоў на Мангэтане адбыўся чарговы сьнежаньскі сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. У пачатку сходу старшыня Згуртаваньня сп. Віталь Зайка азнаёміў прысутных з падзеямі, што адбыліся ў Беларусі цягам апошняга месяцу. Прамоўца ў прыватнасьці спыніўся на перасьледзе апазыцыйных сілаў, у тым ліку падступнага адміністрацыйна-падаткавага ціску ўладаў на адзіны ў краіне беларускамоўны інтэлектуальны незалежны часапіс “Arche”, якому пагражае адмена рэгістрацыі пад штучна створаным прэтэкстам.

Затым сп. Зайка нагадаў прысутным перад праглядам фільму пра Слуцкі Збройы Чын пра асноўныя моманты разьвіцьця падзеяў таго далёкага і слаўнага часу. Пасьля прысутныя на сходзе зь цікавасьцю прагледзелі дакумэнтальны фільм пра Слуцкі Збройны Чын вытворчасьці каналу Белсат, які падрыхтаваў і паказаў праз праектар сябар управы “Пагоні” сп. Яўген Барысевіч.

Прагучэла аб’ява аб правядзеньні ў нядзелю 16 сьнежня сьвяткаваньня Дня Герояў, прысьвечанага 92-м угодкам Слуцкага Збройнага Чыну, што мае адбыцца ў Гайлэнд-Парку, штат Нью-Джэрзі.

Затым была абмеркаваная прапанова правядзеньня мітынгу, прымеркаванага да другой гадавіны драматычных падзеяў пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 19 сьнежня 2010 году ў Менску. Было пастаноўлена правесьці мітынг пратэсту супраць перасьледу беларускай апазыцыі каля штаб-кватэры ААН а 12:30 папаўдні ў сераду 19 сьнежня.

Затым сп. Яўген Барысевіч выступіў з гутаркай пра пляны працы арганізацыі на наступныя месяцы. Ён выказаў думку праводзіць тэматычныя гутаркі з удзелам экспэртаў пра адукцыю і пра пошук працы ў ЗША. Зьвярнуўшыся да прысутных, сп. Барысевіч заклікаў усіх выказвацца і называць тэмы, што маглі б зацікавіць большасьць сяброў. Прысутныя з ахвотаю адгукнуліся й называлі тэмы, інфармацыю пра якія яны зацелі б пачуць: мэнаджмэнт, кампутарныя навукі, палітычныя навукі, рэкляма, гатэльны бізнэс, крымінальная юстыцыя, мэдычныя прафэсіі ды шэраг іншых.

Сп. Я. Барысевіч заклікаў прысутных разглядаць сходы і імпрэзы арганізацыі як плятформу для асабістага разьвіцьця і выкарыстоўваць яе для паляпшэньня сваіх лідэрскіх і камунікацыйных здольнасьцяў. Грамадзкая праца ў беларуска-амэрыканскіх арганізацыях можа трактавацца як валанцёрская дзейнасьць, і такая праца добра выглядае ў рэзюмэ, прыцягвае ўвагу патэнцыйных працадаўцаў як дадатковы досьвед. Адным словам, на ўдзел у сходах варта глядзець як на вартую для скарыстаньня каштоўнасьць.

Перад прысутнымі на сходзе выступіў архіяпіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай (Народнай) Царквы Уладыка Юры. Праводзячы аналёгіі між пакаленьнем Слуцкіх герояў і сёнешняй моладзьдзю, ён заклікаў да працы на карысьць Беларусі і да спадзеву на Госпада таксама як і на свае ўласныя сілы. Ён павіншаваў сяброў “Пагоні” з надыходзячымі Новым годам і Калядамі, пажадаў ім здароўя і посьпехаў.

Пасьля гэтага ў разьдзеле “Рознае” адбылося знаёмства з гасьцямі сходу і новымі сябрамі, прагучалі аб’явы і паведамленьні.

Затым прысутныя маглі ў нязмушаных абставінах калегавацца з землякамі пры сьціплых пачастунках.

Віталь ЗАЙКА

“Галгатня пра ЗыШыА”

Хутка-смачна па-амэрыканску

Ва ўсім сьвеце „drive-through” (едзь-праз) асацыюецца з самай вядомай амэрыканскай рэстарацыяй тыпу „fast food” – Макдональдсам. У самой жа Амэрыцы, па-амэрыканску “drive-thru”, маюць нашмат больш шырокае выкарыстаньне. Тут вы знойдзеце ня толькі дзясяткі розных сетак рэстарацый, на ўзор Макдональдса, але таксама едзь-праз аптэку, едзь-праз банк, едзь-праз краму і нават едзь-праз лікёра-гарэлачны склад. У Лас-Вэгасе можна пабрацца шлюбам у едзь-праз ЗАГСе, а ў Лёс-Анджэлесе разьвітацца з памерлым ў едзь-праз пахавальнай-канторы. Ну а паколькі ў амэрыканскіх гарадах ці не найбольш за ўсё цэркваў, то ажно дзіва бярэ, што яшчэ нікому не прыйшло ў галаву адчыніць едзь-праз царкву. Націскаеш на гузік, расказваеш грахі, пад’яжджаеш пару мэтраў, адчыняецца вакно, высоўваецца рука з кошыкам і рахункам за грахі, укідваеш у кошык грошы, пад’яжджаеш пару мэтраў, зь іншага вакна высоўваецца рука з прычасьцем. Хутка-смачна. Па-амэрыканску.

Віталь ВОРАНАЎ



“Апазыцыя” павінна зьнікнуць. Наперадзе вызвольны рух

Усярэдзіне сьнежня, прыехаўшы ў Нью-Ёрк з Варшавы, я меў гутарку па тэлефоне з адным вядомым старэйшым беларускім дзеячом К., які ў каторы раз выказаў мне абурэньне гэтай “апазыцыяй” зь Беларусі. “Слухайце, – кажа, – што гэта за людзі там пайшлі?! Якая ж гэта, да халеры, апазыцыя?! Нічога ж беларускага няма. У іх жа няма душы беларускай. Прыехалі зноў нейкія тры кабеты ў Вашынгтон. Ім даюць беларускіх перакладчыкаў, а яны: “Нет, мы по-русски, чтобы понятно было.” Каму “понятно”? Амэрыканцам? Амэрыканцы мне кажуць: “Вы цьвердзіце, што Лукашэнка нішчыць беларускую мову, мы вас падтрымліваем, але ж апазыцыя сама ня хоча мовы”. Што там за мазгаўня ў іх у тым Менску? – абураецца К. – Расея сто гадоў усё беларускае нішчыць, палітыку супроць нас вядуць, русіфікуюць, школы ліквідуюць, вырадка гэтага знайшлі, а яны – “нет, нам по-русски”. Ну, слухайце, яны ж хворыя! Прычым тут “апазыцыя”?”

Спадар К. выдатна ўсё ведае і пра “апазыцыю”, і пра Віка, і пра ўсё, што сталася ў Беларусі з гэтай “апазыцыяй”, якая вылыла на паверхню пасьля расколу БНФ. Але пры кожным сутыкненьні з асобамі той “апазыцыі” ён ня можа ня выявіць эмоцыяў, убачыўшы і адчуўшы, што гэта душэўна чужыя для Беларусі людзі. Ён разумее, што тут саўковасьць, але ўсяроўна ня можа стрымаць пачуцьцяў.

Выпадак такі мне прыдаўся, каб паразважаць, бо якраз у гэтыя дні на некаторых мэдыя-рэсурсах адзначалі другія ўгодкі правакацыі і пабіцьця людзей 19 сьнежня на плошчы Незалежнасьці ў Менску. Выказаліся шмат якія ахвяры і правакатары, прадстаўляючы тыя трагічныя падзеі як гераічны чын “апазыцыі”.

У выніку пагрому грамадзкай супольнасьці мноства людзей апынулася тады за кратамі, і ўся ўвага грамадзтва (пры дапамозе СМІ) была пераключана з абмеркаваньня правакацыі і бязглуздых паводзінаў кандыдатаў, што ўдзельнічалі ў выбарчым фарсе, на пакуты вязьняў у турмах, замкнутых там незаконна, неадэкватна і несправядліва.

У цэлым усе размовы і дзеяньні “апазыцыі” такога роду (як тады, так і цяпер) маюць ня шмат сэнсу, бо тут адсутнічае рэальная нацыянальная барацьба, адэкватныя задачы барацьбы і, адпаведна, – нацыянальная сіла, якая магла б такую барацьбу пасьлядоўна ажыцьцяўляць.

Пры акупацыйным рэжыме і акупацыйнай дыктатуры, якая праводзіць антынацыянальную акупацыйную палітыку, ня можа існаваць апазыцыі (у дэмакратычным значэньні гэтага паняцьця). Ва ўмовах антынароднай акупацыйнай палітыкі змаганьне супраць такой палітыкі і рэжыму адбываецца ў формах супраціўленьня, вызвольнага руху ці нават партызанскай паўстанцкай барацьбы (але не “апазыцыі”).

Апазыцыя – гэта адна са структур дэмакратыі і ўзьнікае там, дзе існуе хоць які парлямэнт, законнасьць і выбары. Тады, маючы прадстаўнікоў у парлямэнце і ў грамадзкай супольнасьці, апазыцыя прапаноўвае сваю сыстэму бачаньня разьвіцьця і кіраўніцтва дзяржавай ды змагаецца за яе дэмакратычнымі законнымі мэтадамі (парлямэнт, дэманстрацыі, друк, грамадзкія ініцыятывы, крытыка існуючай палітыкі і г. д.). У гэтай сыстэме адносін улада і апазыцыя ёсьць розналеглыя сілы-супернікі, непрыяцелі і спаборнікі, аб'яднаныя агульнай краінай, агульным правам, нацыяй, дзяржавай, нацыянальнымі каштоўнасьцямі і нацыянальнымі інтарэсамі.

Пры нацыянальнай дыктатуры і ліквідацыі дэмакратыі ў грамадзтва (пазбаўленага альтэрнатывы) застаюцца, аднак, усе пералічаныя мной супольныя з уладай чыньнікі, акрамя самой улады, ад якой народ адлучаны. Улада самаісна распараджаецца агульнымі народнымі і дзяржаўнымі каштоўнасьцямі.

Тым часам пры акупацыйнай дыктатуры, практычна, усе пералічаныя мной аб'яднаўчыя з грамадзтвам чыньнікі адсутнічаюць і (што важна) ператвараюцца ў чыньнікі разьяднаньня.

Акупацыйная дыктатура праводзіць антынацыянальную акупацыйную палітыку ў інтарэсах чужой дзяржавы і ў інтарэсах свайго самазахаваньня ва ўладзе. Тут падвойная дыктатура і падвойны ўціск. Для акупацыйнай улады і палітыкі характэрнымі ёсьць асэнсаванае і сыстэмнае вынішчэньне нацыянальнай мовы, нацыянальнай культуры, нацыянальнай школы, нацыянальнага друку і выдаўніцтва, нацыянальнай асьветы і адукацыі.

Акупацыйная ўлада схільная гандляваць нацыянальным сувэрэнітэтам, нацыянальнымі каштоўнасьцямі і нацыянальнымі рэсурсамі. Яна імкнецца сацыяльнымі, эканамічнымі і адміністрацыйнымі мэтадамі зьмяніць нацыянальную дэмаграфію краіны, шляхам вымушанай унутранай і зьнешняй міграцыі і стварэньнем нецярпімых умоў для працы і свабоды асобы. Да народа антынацыянальны акупацыйны рэжым адносіцца як да чужога акупаванага насельніцтва (Прымусовае высяленьне, згон з зямлі, спаленьне жыльля, пазбаўленьне маёмасьці, прымусовая прывязка да месца працы, разбурэньне традыцыйных інфраструктураў, стварэньне штучнага беспрацоўя шляхам найму замежнай рабочай сілы і выцясненьня карэнных людзей са сфэры вытворчасьці, непавага да нацыянальнай мовы, алькагалізацыя грамадзтва, хамскія жлобскія адносіны ўлады да людзей і г. д.)

Акупацыйная ўлада стварае ўмовы і заканадаўчыя акты, накіраваныя на ліквідацыю нацыянальнай творчасьці і творчага разьвіцьця асобы, паўсюдна ўводзячы заменьнікі чужой культуры, чужой мовы і чужых інтарэсаў, ад якіх залежным ёсьць антынародны акупацыйны рэжым.

Тут ва ўмовах такога тыпу ўлады і такой палітыкі ў прынцыпе ня можа існаваць апазыцыя. Тут іншыя формы барацьбы.

У 90-х гадах мы (фронтаўцы) падрабязна тлумачылі, што такое ўнутраная акупацыя краіны, і якім чынам быў усталяваны такі тып рэжыму ў Беларусі. Тады ж, у 1997 годзе, мной было прапанавана стварэньне Беларускага Вызвольнага Руху на базе БНФ, які павінен быў аб'яднаць усе антырэжымныя беларускія сілы пад Бел-Чырвона-Белым Сьцягам нацыянальнай ідэі і вызваленьня з-пад акупацыйнай антыбеларускай улады. Па гэтым пытаньні была дыскусія ў Фронце, і ў 1997 годзе, на V-м Зьезьдзе БНФ, было прынятае рашэньне аб стварэньні Вызвольнага Руху супраць акупацыйнай дыктатуры.

Менавіта ў гэты час (у адказ на нашу пэрспэктыву стварэньня салідарнай нацыянальнай альтэрнатывы рэжыму) былі кінутыя ў Беларусь шалёныя заходнія грошы на ўтварэньне па-за-нацыянальнай апазыцыі – створаны міжнародны рэсурсны цэнтар Хартыя-97 (празь які пайшло фінансаваньне), і ў Беларусь прыслалі Ганса Віка. Далейшыя падзеі шматкроць і поўна былі ўжо намі апісаныя і паўтараныя. Грошы і заходняя “халява” (дармаўшчына) зрабілі сваю справу.

(Тут зазначу, што ў нацыянальна скансалідаваным грамадзтве чужыя грошы наўрад ці стварылі б там сваю палітычную крэатуру, таму першай справай, за якую ўзяліся заходнія гансвікі, – гэта гуртаваньне саветызаваных маргіналаў і раскол Народнага Фронту.)

Структуру, якую назвалі “апазыцыя”, сшылі зь неадраджэнцкіх партыяў (створаных яшчэ пры саветах спэцслужбамі), з прагматыкаў – выхадцаў з БНФ, з камуністаў і з былых функцыянэраў Лукашэнкі, якія аб'явілі сябе апазыцыянэрамі.

Разбуральны эфэкт і параліч рэальнай барацьбы пасьля расколу БНФ і стварэньня падставы пад назовам “апазыцыя” быў адчувальны. Квітнела імітацыя змаганьня, накіраваная на адпрацоўку грантаў і дармовых грошай. Нам (КХП – БНФ) спатрэбілася больш 10-ці гадоў мэтанакіраванай працы з грамадзтвам, каб абыйсьці тое гнілое балота, створанае імітатарамі, выйсьці на стыхійны (пакуль што) байкот выбараў і новае грамадзкае думаньне аб палітыцы акупацыйнага рэжыму.

Групы падтрымкі Народнай партыі, якія мы прапануем ствараць на адраджэнцкай

Заканчэньне на 4-й бачыне

Апазыцыя павінна зьнікнуць...

Заканчэньне з бачыны 3

платформе, – гэта першы этап арганізацыі Вызвольнага Руху на новай народнай аснове. Пакуль ня ўзьнікне рэальная народная альтэрнатыва акупацыйнаму рэжыму – датуль гэтая вікаўская "апазыцыя" будзе яшчэ боўтацца ў палітыцы, выклікаючы злосьць, апатыю, расчараваньне і фальш.

Прыкметы імітацыйнага жыцьця ў змаразмацелай ужо "апазыцыі" праяўляе яшчэ "Говправду", галоўны на сёньняшні дзень канторскі праект у змарнелым полі вікаўскай авантуры. Сувязь з "спэцпалітыкай" тут ужо нават не хаваюць. "Говправду" выступіла супраць байкоту, удзельнічала ў апошніх фальшывых выбарах рэжыму, падтрымлівае расейскую атаку на Курапаты (авантуру падпалкоўніка Кузьняцова) і рыхтуецца да фальш-выбараў 2015 г.

Ведаючы пра антынацыянальны характар "Говправду" і пра маскоўскую рыторыку ў Някляева, я ў 2010-11 гадах, нягледзячы на тое, прыклаў усё ж шмат намаганьняў (разам зь іншымі беларусамі), каб Някляеў застаўся жывым і не сядзеў за кратамі. Для беларускай культуры важны ёсьць ягоны літаратурны даробак і паэтычнае імя, а ня тая роля, у якой ён апынуўся па ўласным жаданьні. Пасьля здрадніцкіх паводзінаў функцыянэра "Говправду" А. Дзімітрыева і выхаду паэта з турмы, У. Някляеў меў нагоду зьмяніць сваё становішча на больш ганаровае і пазбавіцца ад гэтай структуры. Таго не адбылося. Паэт застаўся ў дрэннай палітыцы, і тое, што ён цяпер робіць і кажа, вымагае палітычных ацэнак.

Шчыра кажучы, шкода, што Някляеў трапіў у чужую схему. З усіх 10-ці кандыдатаў на прэзыдэнта ў 2010 годзе рэальна толькі Някляеў (ня лічачы Лукашэнкі) сабраў патрэбную квоту подпісаў каб стаць кандыдатам. Але паколькі "дзявятка" была праектам рэжыму, Лукашэнка асабіста распарадзіўся, каб у кандыдаты залічылі ўсіх (нават тых, хто перапісаў тэлефонную кнігу).

Дзесьці за паўтары месяцы да галасаваньня недзяржаўныя сацыялягічныя дасьледваньні паказалі, што першым пасьля Лукашэнкі ідзе Някляеў (18 адсоткаў). За ім – усе астатнія: М. Статкевіч, А. Саньнікаў і г. д.

Гэтакі ж парадак паказала і рэальнае галасаваньне (маю факты). Але паколькі ў час галасаваньня Някляева па замове Лукашэнкі сьмяртэльна зьбілі рэжымныя службы, то яго (каб не рабіць аб'ектам асаблівай увагі) пракінулі на трэцяе месца, а на другое паставілі Саньнікава.

Агітпроп "Говправду" нідзе і аніяк не скарыстаў гэты факт (навошта такое канторы). Тым часам "Хартыя" і нешматлікі клян Саньнікава пакарысталіся падарункам Ярмошынай на сто адсоткаў. Раззванілі на ўвесь сьвет, ляпілі з Саньнікава галоўнага суперніка Лукашэнкі, якога той, маўляў, баіцца і г. д. і т. п.

Няма ўжо патрэбы ацэньваць усё тое спрэчнае, што паэт казаў і рабіў у 2010 годзе. Апошняя ягоная канфэрэнцыя ў Сеціве на радыё "Свабода" у пачатку сьнежня паказала тое, што і раней, толькі больш сканцэнтравана, менавіта – адсутнасьць нацыянальнага палітычнага думаньня. Някляеў ня думае нацыянальнымі катэгорыямі беларускай палітыкі. А гэта (асабліва цяпер, пры антыбеларускім рэжыме) выглядае ня проста балесна, а фатальна для палітычнай пэрспэктывы такой асобы (ды і для Беларусі тым больш). У некаторых аспэктах нацыянальнага сувэрэнітэту (напрыклад, адмаўленьне моцнага беларускага войска) ён апускаецца нават ніжэй за ўзровень Лукашэнкі, не разумее стандартных складовых незалежнасьці (тым больш у нашых геапалітычных умовах) і гатовы ад іх адмовіцца.

У цэлым тут ёсьць таксама адбіцьцё поглядаў асяродзьдзя, у якое трапіў паэт, але тое не мяняе становішча. Гэтакая палітыка, гэтакія структуры і гэтакае словаблудзтва з функцыянерамі і вясельнымі генераламі павінна ўжо скончыцца, скончыцца разам з рэжымам, які іх спарадзіў.

Новыя людзі прыйдуць, бо ёсьць ужо тыя, што думаюць па-новаму, не па-саўковаму, але па-свойму, па-беларуску.

Без нацыянальна-культурнай беларускай асьветы цяперашняга грамадзтва перамены да лепшага ня будуць ажыцьцёўлены. Групы падтрымкі гэтым павінны займацца ў першую чаргу, пакуль іх ня створыцца шмат і ні пачнецца новы этап Вызвольнага Руху. Усе тыя суполкі (іх больш ста пяцідзесяці), якія стварыліся ў 2011 годзе пад лёзунгам "За новыя выбары без Лукашэнкі" маглі б уключыцца ў гэтую адраджэнцкую праграму дзеяньняў, не чакаючы ніякіх кіроўных указаньняў (іх ня будзе). Гуртуймася і працуйма. Нішто не прападзе. Беларусь наперадзе.

23 сьнежня 2012 г.

Зянон ПАЗЬНЯК

Узнаўляемыя крыніцы энэргіі –
гарантыя надзейнага і невычарпальнага энэргазабесьпячэньня

Спажываньне энэргіі ў сьвеце пастаянна павялічваецца і ўжо перавысіла 18,5 млрд. тон умоўнага паліва ў год (т у.п./год). Пацверджаныя запасы асноўных відаў выкапневага паліва (вугаль, нафта, газ) ацэньваюцца прыкладна ў 1 100 млрд. т у.п. Пры існуючым узроўні спажываньня разведаных запасаў паліва хопіць ня болей, чым на 60 гадоў. Запасаў ядзернага паліва яшчэ меней. Напрыклад, здабываемы сёньня ў Расеі ўран складае 20 % ад усяго спажываемага там урану. Розьніца пакуль што пакрываецца за кошт савецкіх запасаў, якія ўжо блізкія да вычарпаньня.

Ацэньваючы пэрспэктывы разьвіцьця сусьветнай энэргетыкі, Нобелеўскі ляўрэат Жарэс Алфёраў 19 верасьня 2012 году ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сказаў наступныя словы: "Да канца бягучага стагодзьдзя, безумоўна, энэргетычная праблема чалавецтва будзе вырашана на аснове выкарыстаньня сонечнай энэргіі. А ядзерная энэргетыка застанецца ва ўспамінах". Нельга не прыслухацца да словаў сусьветнавядомага вучонага, асабліва тым, хто з упартасьцю, вартай іншага прымяненьня, штурхае рэалізацыю праекта Астравецкай АЭС замест таго, каб спрыяць разьвіцьцю ў Беларусі ўзнаўляемых крыніцаў энэргіі (далей – УКЭ).

Навуковая ацэнка праблемы

Адносная стабільнасьць тэмпературы Зямлі сьведчыць аб пэўным баляньсе энэргіі, якая прыходзіць да Зямлі з космасу і адыходзіць ад яе ў касьмічную прастору. Асноўную частку энэргіі, якая паступае на Зямлю, складае сонечнае выпраменьваньне. Паток гэтай энэргіі ацэньваецца ў 173 000 ТВт (173 000 Х 10^{12} Вт).

Каля 52 000 ТВт (30 % паступаючага сонечнага выпраменьваньня) адбіваецца атмасферай і паверхняй Зямлі назад у космас, што характэрызуе альбеда Зямлі. Астатняя энэргія, 121 000 ТВт, пранікае да паверхні Зямлі, пераўтвараецца ў цяпло і перавыпраменьваецца ў касьмічную прастору ў выглядзе доўгахвалевага інфрачырвонага выпраменьваньня. Сумарная ўстаноўленая магутнасьць усіх электрастанцый сьвету роўная прыкладна 3 Х 10^{12} Вт, што больш, як у 40 тыс. разоў меней. Прыкладна 2 % (3600 ТВт) паступаючай на Зямлю сонечнай энэргіі пераўтвараецца ў энэргію вятроў. Зь іх 1/3 (1200 ТВт) разьмяркоўваецца ў ніжніх слаях атмасфэры на вышыні да 1 км.

Акрамя сонечнага выпраменьваньня на Зямлю паступае энэргія, якая ўзьнікае ў выніку гравітацыйнага ўплыву пера-

важна Месяца. Дзякуючы гэтаму ўплыву, утвараецца энэргія прыліваў. Сярэдняя магутнасьць патока гэтай энэргіі складае каля 3 ТВт.

Унутранай крыніцай энэргіі Зямлі зьяўляецца цеплавая энэргія ад радыёактыўнага распаду некаторых хімічных элемэнтаў унутры зямнога ядра (32 ТВт).

Тэмпы спажываньня энэргіі чалавекам на працягу вякоў пастаянна ўзрастаюць. У старажытныя часы чалавек атрымоўваў энэргію выключна праз ежу, спажываючы ў дзень прыкладна 2000 ккал, што адпавядае магутнасьці 100 Вт. Значна пазьней, калі людзі сталі карыстацца агнём, выкарыстаньне энэргіі павялічылася прыкладна да 300 Вт у дзень на аднаго чалавека.

Калі да 2050 года кожны з 11 млрд. жыхароў Зямлі будзе спажываць энэргіі (у сэнсе ўстаноўленай магутнасьці) на ўзроўні сучаснага жыхара ЗША (11 кВт), то агульнае энэргаспажываньне ўзрасьце да 122 ТВт, што ў 15 разоў болей сучаснага энэргаспажываньня (каля 8 ТВт). (Крыніца: *А. Да Роза. Узнаўляемыя крыніцы энергіі. Фізіка-тэхнічныя асновы: вучэбны дапаможнік на аснове курсу лекцый у Стэнфардскім універсытэце для студэнтаў і выкладчыкаў інжынерна-фізічных факультэтаў, даследчыкаў і распрацоўшчыкаў, спэцыялістаў-энэргетыкаў. Пераклад з ангельскай мовы. Выдавецкі дом МЭІ; 2010*).

Неабходны рост вытворчасьці энэргіі магчымы выключна пры выкарыстаньні інавацыйных тэхналёгій і больш эфэктыўнага пераўтварэньня энэргіі. Па навуковых ацэнках рэсурсы ўсіх узнаўляемых крыніцаў энэргіі ў шмат разоў пераўзыходзяць сёньняшні і прагназуемы ўзровень энэргаспажываньня.

УКЭ адносна раўнамерна распаўсюджаны па зямной кулі, не знаходзяцца ў манапольным валоданьні абмежаванага кола краінаў, і таму разглядаюцца як крыніцы энэргіі, выкарыстаньне якіх спрыяе павышэньню энэргетычнай бясьпекі многіх краін, зьніжэньню залежнасьці ад імпарту энэргетычных рэсурсаў і, адпаведна, умацаваньню палітычнай стабільнасьці ў сьвеце.

Відавочна, што акрамя ўзнаўляемых крыніцаў энэргіі ў людзей няма іншай альтэрнатывы надзейнага і невычарпальнага энэргазабяспечаньня. Але пры існуючым узроўні тэхналягічнага разьвіцьця і кан'юнктуры, якая склалася на сусьветных энэргетычных рынках, такія відавочныя перавагі ЎКЭ як невычарпальнасьць, адсутнасьць выдаткаў на паліва і экалягічная бясьпека, пакуль ня могуць пераважыць добра адпрацаваныя, простыя і таньнейшыя мэтады атрыманьня энэргіі з традыцыйнага вуглевадароднага паліва.

У такіх умовах большасьць краінаў ужо ўсьвядоміла неабходнасьць дзяржаўнай падтрымкі разьвіцця ЎКЭ. Калі ў 1980–пачатку 90-х гадоў гэтае пытаньне практычна не разглядалася на дзяржаўным узроўні, то ў 1998-2005 гадах многія краіны пачалі прымаць захады па распрацоўцы цэлай сыстэмы мераў па падтрымцы ЎКЭ. Пэрыяд з 2005 па 2011 год стаўся асабліва выніковым. Колькасьць краінаў, якія рэалізуюць у той ці іншай меры палітыку падтрымкі УКЭ, павялічылася з 55 у 2005 годзе да 118 у пачатку 2011 году.

Урады многіх краінаў распрацоўваюць сыстэмы стымулаў і гарантый, якія маглі б забясьпечыць належныя ўмовы для разьвіцьця ўзнаўляемых крыніцаў энэргіі. Асабліва эфэктыўным зьяўляецца выкарыстаньне не асобных стымулаў, а іх сыстэмаў, напрыклад, увядзеньне падаткавых ільготаў сумесна з запускам спэцыяльнай адукацыйнай праграмы.

Палітыка дзяржаваў, накіраваная на стымуляваньне вытворчасьці і спажываньня энэргіі ЎКЭ ўжо прывяла да значных вынікаў. Мэтавыя паказьнікі 2010 году ў Эўразьвязе былі значна перавыкананыя. Устаноўленая магутнасьць ветраэнэргетыкі склала 86 тыс. МВт замест запланаваных 40 тыс. МВт, сонечнай фотаэлектрычнай энэргіі – 29 тыс. МВт замест 3 тыс. МВт. Пры захаваньні такога тэмпу росту, Эўразьвяз ужо да 2020 году зможа пераўзыйсьці заплянаваную долю УКЭ 20 % у агульным аб'ёме выпрацаванай энэргіі.

На вялікі жаль, у Беларусі дзяржаўная падтрымка разьвіцьця ЎКЭ недастатковая. Акрамя "зялёных тарыфаў", устаноўленых пастановаю Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2011 г. № 100 для вытворцаў энэргіі, выраблямай УКЭ, іншых мераў дзяржаўнай падтрымкі не прадугледжана. Ды і тая падтрымка (каэфіцыент 1,3 на продаж энергіі ў першыя 10 гадоў з дня ўводу ў эксплюатацыю ЎКЭ, у хуткім часе ператвараецца для вытворцаў у страты, паколькі ў наступныя 10 гадоў эксплюатацыі каэфіцыента 1,3, паводле той жа пастановы, пераўтвараецца ў 0,85.

Ва ўмовах Беларусі найбольш пэрспэктыўнымі ўзнаўляемымі крыніцамі энэргіі зьяўляюцца энэргія біямасы, ветраэнэргетыка, гідраэнэргетыка, сонечная энэргія.

Наша краіна валодае таксама пэўным патэнцыялам геатэрмальнай энэргіі, але існуе шэраг праблемаў, зьвязаных зь ягоным асваеньнем. Неабходныя дасьледваньні для абгрунтаваньня тэхніка-эканамічных і экалягічных фактараў разьвіцьця гэтай крыніцы энэргіі ў Беларусі.

Разьлікі паказваюць, што тэхнічна магчымы і эканамічна мэтазгодны патэнцыял найбольш пэрспэктыўных ва ўмовах Беларусі ўзнаўляемых крыніцаў энэргіі складае больш за 75 млрд. кВт·г/год, што амаль у два разы перавышае аб'ём спажываньня электраэнэргіі ў краіне (каля 38 млрд. кВт·г/год). Відавочна, што патэнцыял узнаўляемых крыніцаў энэргіі ў Беларусі дастатковы для таго, каб ужо ў хуткім часе значна скараціць аб'ёмы выкарыстаньня традыцыйнага вуглевадароднага паліва, імпартуемага з Расеі па пастаянна павялічваемых і непазбежна набліжаемых да сусьветнага ўзроўню цэнах, а ў пэрспэктыве – поўнасьцю забясьпечыць эканоміку краіны надзейнай і невычарпальнай энэргіяй. У Маскве гэта добра разумеюць, таму імкнуцца як мага хутчэй узяць пад свой кантроль беларускую энэргасыстэму, каб надзейна прывязаць яе да расейскіх энэрганосьбітаў.

У якім жа стане знаходзяцца сёньня ў Беларусі ўзнаўляемыя крыніцы энэргіі?

Энэргія біямасы

Акрамя традыцыйна выкарыстоўваемых у краіне дроў і драўнінных адходаў, значнае разьвіцьцё можа атрымаць вытворчасьць біягазу, сыравінай для якога зьяўляеюцца цьвёрдыя бытавыя адхкіды і адкіды сельскай гаспадаркі.

Патэнцыял цьвёрдых бытавых адходаў ацэньваецца ў 470 тыс. т у.п.

Агульны патэнцыял выпрацоўкі біягаза на фермах і комплексах па вырошчваньню буйной рагатай жывёлы, сьвіней і птушкі складае 1600-2200 млн. м^2, 360-620 млн. м^2, і 105-210 млн. м^2 у год адпаведна, а агульны аб'ём замяшчэньня – 1,6-2,4 млн. т у.п.

Разьвіцьцё гэтай галіны дазваляе вырашыць шэраг энэргетычных, эканамічных і экалягічных праблемаў:

- павышаецца энэргабясьпека краіны;
- ствараюцца дадатковыя працоўныя месцы ў рэгіёнах;
- разьвіваюцца сучасныя тэхналёгіі;
- зьніжаецца шкоднае ўзьдзеяньне на навакольнае асяродзьдзе і інш.

Ветраэнэргетыка

Паводле Нацыянальнай праграмы разьвіцьця мясцовых і ўзнаўляемых энэргакрыніцаў на 2011-2015 гады, ветраэнэргетычны патэнцыял Беларусі ацэньваецца ў 1600 МВт з гадавой выпрацоўкай электраэнэргіі 2,4 млрд. кВт·г, што дазваляе замяніць 672 тыс. т у.п. Па ацэнках спэцыялістаў ветраэнэргетычны патэнцыял Беларусі значна большы – каля 3000 МВт з гадавой выпрацоўкай электраэнэргіі каля 4,5 млрд. кВт·г.

Сёньня сумарная ўстаноўленая магутнасьць ветраэнэргетычных установак (ВЭУ) Беларусі, складае 4,07 МВт. Гэта толькі 0,25 % ветраэнэргетычнага патэнцыялу краіны.

Працяг на 6-й бачыне

Узнаўляемыя крыніцы энэргіі

Працяг з бачыны 5

Галоўнымі прычынамі нізкага ўзроўню выкарыстаньня ў Беларусі ветраэнэргетыкі зьяўляюцца недастатковая дзяржаўная падтрымка разьвіцця ЎКЭ і неэфэктыўная праца органаў дзяржаўнага кіраваньня з замежнымі інвэстарамі. Вось яскравы прыклад. Вядомая нямецкая кампанія Enertrag мела намер за ўласныя сродкі пабудаваць у Беларусі прамысловы ветрапарк магутнасьцю каля 160 МВт. Гэта адпавядае Стратэгіі разьвіцьця энэргетычнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь, зацьверджанай пастановай Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь 09.08.2010 № 1180. Паводле Стратэгіі прадугледжвалася ў 2011-2015 гадах будаўніцтва ветрапаркаў сумарнай магутнасьцю 300 МВт, у тым ліку ветрапарка ў Дзяржынскім раёне магутнасьцю 160 МВт.

У ліпені 2010 году паміж Менскім аблвыканкамам і нямецкай Кампаніяй Enertrag (інвэстар) была падпісаная інвэстыцыйная дамова аб будаўніцтве ветрапарка ў Дзяржынскім раёне. Кошт праекта каля 360 млн. эўра. Завершыць рэалізацыю праекту прадугледжвалася ў 2012 годзе.

У адпаведнасьці з інвэстыцыйнай дамовай на правядзеньне падрыхтоўчых работ і неабходных дасьледваньняў кампанія Enertrag інвэставала 300 000 эўра. Пасьля гэтага Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь заявіла, што ветраэнэргетычныя ўстаноўкі вышынёй каля 200 метраў могуць парушыць работу радараў, якія знаходзяцца недалёка ад Дзяржынска, а гэта зьніжае эфэктыўнасьць работы сыстэмы супрацьпаветранай абароны. Менаблвыканкам адразу прапанаваў інвэстару рэалізаваць інвэстыцыйную дамову ў іншым месцы, напрыклад, на тэрыторыі Лагойскага або Барысаўскага раёнаў, але без кампэнсацыі панесеных інвэстарам выдаткаў. Зразумела, што інвэстар ад такога "супрацоўніцтва" адмовіўся.

У якасьці даведкі варта адзначыць, што інвэстыцыйнай дамовай не прадугледжвалася будаўніцтва ў Дзяржынскім раёне ВЭУ вышынёй 200 м, бо гэта эканамічна немэтазгодна. Аптымальная вышыня ВЭУ не перавышае 100 мэтраў. Вышыня самай эфэктыўнай з працуючых сёньня ў Беларусі Грабнікаўскай ВЭУ складае 82 мэтры, а сабекошт выпрацоўваемай на ёй электраэнэргіі – $0,0485/кВт·г. (4,85 цэнтаў/кВт·г.), што на 30 % ніжэй за сярэдні сабекошт электраэнэргіі ў Беларусі (7 цэнтаў/кВт·г.).

Гідраэнэргетыка

Патэнцыйная магутнасьць усіх вадатокаў Беларусі складае 850 МВт. Тэхнічна даступны патэнцыял ацэньваецца ў 520 МВт, а эканамічна мэтазгодны – 250 МВт.

З улікам уведзенай у эксплюатацыю 31 жніўня 2012 году Гарадзенскай ГЭС магутнасьцю 17 МВт, сёньня ў Беларусі працуюць 42 ГЭС сумарнай магутнасьцю 33,1 МВт, што складае 6,4 % ад тэхнічна даступнага патэнцыялу.

Галоўнымі перавагамі ГЭС перад цеплавымі электрастанцыямі зьяўляюцца:

- невычарпальнасьць энэргіі і адсутнасьць патрэбы ў арганічным паліве;
- ніжэйшы кошт вырабляемай электраэнэргіі, напрыклад, сабекошт электраэнэргіі, вырабляемай Асіповіцкай ГЭС складае $0,039/кВт·г. (3,9 цэнта/кВт·г.);
- адсутнасьць шкодных выкідаў.

Да недахопаў ГЭС варта аднесьці:

- затапленьне тэрыторый і зьмяненьне структуры землекарыстаньня;
- неабходнасьць перасяленьня людзей з зоны будаўніцтва ГЭС.

Дзяржаўнай праграмай будаўніцтва ў 2011-2015 гадах гідраэлектрастанцый у Рэспубліцы Беларусь прадугледжана будаўніцтва яшчэ адной ГЭС на рацэ Нёман магутнасцю 20 МВт, чатырох ГЭС сумарнай магутнасцю 112 МВт на рацэ Дзьвіна і чатырох ГЭС на рацэ Дняпро сумарнай магутнасьцю 20,3 МВт. Пры ўводзе іх у эксплюатацыю ўстаноўленая магутнасьць усіх беларускіх ГЭС складзе больш за 180 МВт.

У пэрспэктыве пасьля 2020 году на ГЭС Беларусі можа быць дасягнута выпрацоўка 1 млрд. кВт·г электраэнэргіі ў год (каля 3 % выпрацоўваемай у краіне электраэнэргіі).

Сонечная энэргія

Тэхнічна магчымы патэнцыял сонечнай энэргіі ў нашай краіне ацэньваецца ў 150-250 млрд. кВт·г., што ў 4-6 разоў пераўзыходзіць сёньняшні і прагназуемы ўзровень энэргаспажываньня ў краіне.

У сярэднім за суткі на 1 м^2 паверхні Беларусі, з улікам начнога часу, хмарнасьці і іншых фактараў паступае 2,8 кВт·г. сонечнай энэргіі. Удзельная магутнасьць сонечнай энэргіі, якая паступае на тэрыторыю нашай краіны, нават крыху большая, чым у Нямеччыне, Вялікабрытаніі, Даніі. Аднак Нямеччына ўжо асвоіла больш за 17 тыс. МВт устаноўленай сонечнай магутнасьці, а Беларусь асваеньне сонечнай энэргіі толькі пачынае.

Пераўтварэньне сонечнай энэргіі ў электраэнэргію ажыцьцяўляецца двума мэтадамі – тэрмадынамічным і фотаэлектрычным (фотавальтаіка).

Пры першым мэтадзе сонечная энэргія пераўтвараецца ў цеплавую энэргію з дапамогай тэрмічных панэляў. Атрыманую цеплавую энэргію можна выкарыстоўваць непасрэдна ці пераўтвараць у электрычную энэргію.

Пры другім метадзе для атрыманьня электраэнэргіі выкарыстоўваюцца фотаэлементы – электронныя прыборы, якія пераўтвараюць энэргію фатонаў сьвятла ў электрычную энэргію. Гэты мэтад мае шырэйшае прымяненьне.

Сёньня сонечная энэргія з-за яе высокага кошту зьяўляецца нерэнтабельнай і патрабуе дзяржаўнай падтрымкі. Але па дадзеных Эўрапейскай Асацыяцыі фотавальтаікі, да 2020 году кошт сонечнай энэргіі зьнізіцца да $100/МВт·г. (10 цэнтаў за 1 кВт·г.), а гэта азначае тое, што ўжо ў хуткім часе сонечная энэргія стане канкурэнтаздольнай і найбольш пэрспэктыўнай крыніцай энэргіі.

Геатэрмальная энэргія

Беларусь валодае значнымі запасамі геатэрмальнай энэргіі з энэргетычным патэнцыялам больш за 2 т у.п./м^2 і тэмпературай 50° С на глыбіні 1,6 км і 90-100° С на глыбіні 4 км. Аднак няма інфармацыі аб навуковых дасьледваньнях, якія праводзяцца ў нашай краіне ў гэтай галіне. Вядзецца толькі падрыхтоўка абгрунтаваньня разьвіцця геатэрмальнай энэргіі.

Асноўнымі недахопамі выкарыстаньня геатэрмальнай энэргіі зьяўляюцца:

- выкіды газаў, якія ўтрымліваюць прымесі метану, серавадароду, азоту, аміяку;
- павышэньне ў вадаёмах канцэнтрацыі соляў (хларысты натрый, бор, мыш'як, ртуць, калій і інш.) пры скідзе ў іх ахалоджваючых водаў і кандэнсату;
- магчымасьць забруджваньня паверхневых і грунтовых водаў пры выкідах раствораў высокай канцэнтрацыі пад час сьвідраваньня сьвідравін.

Для Беларусі пэрспэктыўным накірункам зьяўляецца выкарыстаньне нізкапатэнцыйнай энэргіі зямлі пры дапамозе цеплавых помпаў.

Галоўныя высновы

1. Асноўнай вартасьцю ўзнаўляемых крыніц энэргіі зьяўляецца іх невычарпальнасьць, адсутнасьць выдаткаў на паліва і экалягічная бясьпека.

Заканчэньне на бачыне 8

Новыя зьявы ў гісторыі гэбраяў Амэрыкі

Перавыбары Барака Хусэйна Абамы на пасаду прэзыдэнта Злучаных Штатаў яшчэ раз асьвятлілі пэўныя тэндэнцыі сярод гэбраяў Амэрыкі, што нясуць зьмены й непрадказальныя наступствы як для гэтай уплывовай амэрыканскай эгнічнай групы, так і для амэрыканскага грамадзтва наагул. Агульна прызнана, што гэбраі зьяўляюцца самай пасьпяховай этнарэлігійнай супольнасьцю ў ЗША, маюць найвышэйшыя паказчыкі прыбыткаў на душу насельніцтва, найвялікшую адносную колькасьць асобаў з вышэйшай адукацыяй, дамінуюць у мэдыцынскай і юрыдычнай прафэсіях у шмат якіх штатах, шырака прадстаўленыя сярод журналістаў і мэдыя-асобаў, фінансістаў і банкіраў, буйных прадпрыймальнікаў, дзеячаў фільмовай індустрыі, а таксама сярод палітыкаў.

Ня менш уражваючыя дасягненьні і гэбрайскіх арганізацыяў. Кожны, хто хоць крыху пажыў у Амэрыцы, напэўна чуў пра шпіталі Бэт Ізраэль, Маўнт Сінай, мэдцэнтры Маймонідас і Мантэфьёры, пра Ешыва-унівэрсытэт і Тура-каледж, пра Музэй Галакасту ў Вашынгтоне, пра лябісцкую праізраільскую групу АЙПАК, пра культурніцкі цэнтар Y на 92-й вуліцы ў Нью-Ёрку ды розныя іншыя структуры створаныя гэбраямі, і з шмат з каторых карыстаюць розныя іншыя жыхары Амэрыкі негэбраі.

Можна бясконца пералічваць імёны гэбраяў, што сталі культурніцкімі іконамі Амэрыкі: Гары Гудыні, Гэртруд Стайн, Эды Кантар, Давід Сарноў, Джордж Гэршвін, Ман Рэй, Айн Ранд, Ірвінг Бэрлін, Бэрнард Маламуд, Боб Дылан, Артур Мілер, Сол Бэлаў, Марк Ротка, Норман Майлер, Барбра Стрэйсанд, Вуды Алэн, Зыро Мостэл, Стывэн Спілбэрг і г.д. Амэрыканскія гэбраі моцна спрычыніліся да ўтварэньня дзяржавы Ізраіль у 1948 годзе, паўплывалі на амэрыканскую паваенную палітыку ў дачыненьні да Нямеччыны й Саветаў, дапамаглі дабіцца дазволу на эміграцыю для савецкіх гэбраяў (і некаторыя лічаць, гэтым разваліілі СССР), зрабілі Галакаст ці не найболей выкладанай і дасьледванай тэмай у школах ды ўнівэрсытэтах.

Шмат разоў паўтаралася выслоўе Never Again! – Ніколі больш, гэбрайская грамада Амэрыкі ня будзе сядзець склаўшы рукі, калі суродзічам пагражае небясьпека або парушаюцца іхныя правы. Гэтае выслоўе-клятва ўзьнікла пасьля Другой сусьветнай вайны, калі стала вядома, колькі мільёнаў эўрапэйскіх гэбраяў былі зьнішчаныя нацыстамі, і наколькі неадэкватнымі гэтаму былі высілкі амэрыканскіх гэбраяў дапамагчы сваім братам. І сапраўды, паваенныя дзесяцігодзьдзі паказалі, што амэрыканскія гэбраі могуць быць мэгаўплывовымі й супэрэфэктыўнымі, ратуючы і баронячы сваіх адзінаверцаў ад дыскрымінацыі ў самых Злучаных Штатах, а таксама ў Польшчы, Іраку, Сырыі, СССР, Румыніі, Іране, Эфіёпіі...

Сёньня выглядае, што тое выслоўе-лёзунг "Ніколі болей" можа ў рэчаіснасьці зьмяніцца на прыпеў з расейскай цыганскай песьні: "Эх раз, ды яшчэ раз...". Псэўда-лібэральны "сьветацям", утапічнае ўяўленьне пра тое, як 99% чалавецтва кіруюцца пекнымі дабратворнымі парывамі душы, а толькі 1% гнюсотаў-банкіраў ды палітыканаў-рэспубліканцаў замінаюць надыходу дзесяцітысячагадовага панаваньня шчасьця й гармоніі – моцна закранулі гэбрайскую грамаду. Як вядома, пераважная большасьць гэбраяў галасуюць за дэмакратаў, і гістарычна гэта было абумоўлена блізкасьцю дэмакратаў у першай палове 20-га стагодзьдзя да справы сацыяльнай справядлівасьці, пераадоленьня цяжкай спадчыны міжрасавых адносінаў на Поўдні, сапраўдныя ці ўяўныя сымпатыі дэмакратаў да гэбрайскіх праблемаў (дыскрымінацыя, свабода рэлігіі, абсалютнае адмежаваньне дзяржавы ад царквы). Сёньня, калі гэбраі дасягнулі ўсіх накрэсьленых мэтаў, і калі Дэмпартыя перарадзілася ў партыю танных папулістаў, імпартэраў электарату і вызнавальнікаў прота-таталітарызму, падтрымка Дэмпартыі гэбраямі выглядае нечым большым, чым простай бязглуздзіцай. Гэта ня проста недаразуменьне, калі, па трапным выразе, гэбраі "зарабляюць, як белыя пратэстанты, але галасуюць як пуэртарыканцы". Ідзе фактычна галасаваньне за ўласнае разбурэньне, за самаліквідацыю.

Вядома, што гэбраі бралі самы актыўны ўдзел у руху за грамадзянскія правы чорнага насельніцтва ў 1950-я і 1960-я гады. Студэнты і адвакаты бралі ўдзел у маршах на Поўдні, у "паездках свабоды" на сэгрэгаваных аўтобусах. Некалькі чалавек загінулі за сваіх чорных братоў. Рабіны й гэбрайскія грамадзкія лідэры рассылалі пратэсты й петыцыі, ішлі поруч з Мартынам Лютэрам Кінгам у Маршы на Вашынгтон. Але супрацоўніцтва хутка скончылася пасьля падпісаньня дэсэгрэгацыйных законаў. Чорныя лідэры сталі вінаваціць гэбраяў у імкненьні скарыстаць іхную бяду, каб зрабіць сабе рэкляму і выкарыстаць на сваю вузкаэтнічную карысьць. Ніякія апраўданьні не спрацавалі, гэбрайскае грамадзтва не змагло давесьці афрамэрыканцам, што гэта ня так. У выніку адносіны застаюцца папсаваныя дасюль.

Цяпер падобныя граблі знайшліся перад гэбрайскімі лідэрамі ў выглядзе ўяўных "парушэньняў правоў мусульманаў у ЗША", што насамрэч не існуюць, але ўсяляк разьдзьмухваюцца ісламісцкімі арганізацыямі, якія перакручваюць факты супрацьстаяньня ваяўнічаму ісламскаму супрэматызму ў "расізм", "ісламафобію". Гэбрайскія лідэры купляюцца на танную двуххадовую гульню такіх падступных ісламісцкіх арганізацыяў у ЗША, як Рада па Амэрыкана-Ісламскіх Дачыненьнях, Мусульманская Студэнцкая Асацыяцыя ды Ісламскае Таварыства Паўночнай Амэрыкі. Братаючыся з ісламістамі й асуджаючы тых, хто "непаліткарэктна" асьмельваюцца казаць праўду пра дзеяньні ісламістаў, гэбрайскія лідэры кшталту прэзыдэнта Антыдэфамацыйнай Лігі Абрагама Фоксмана ды лідэра Рэфармаванага юдаізму рабіна Дэвіда Сапэрстына наіўна спадзяюцца, што заснаваныя ў ЗША мусульманскімі "братчыкамі" арганізацыі зробяцца іхнымі прыяцелямі ды альянтамі. Таму яны закрываюць вочы на факты маральнай, а часам і чыннай, падтрымкі амэрыканскімі ісламістамі тэрарызму, антыамэрыканскай рэторыкі ды антысэмітызму.

Варта нагадаць, як ставіліся да сваіх часовых сяброў ды альянтаў бальшавікі, што ўжывалі іх як "карысных дурняў". Гэтак жа "карыснымі" ёсьць цяпер для ісламістаў Антыдэфамацыйная Ліга, рух Рэфармаванага Юдаізму, гэбраі-палітыкі Дэмпартыі, сотні псэўда-лібэральных унівэрсытэцкіх прафэсараў, дзясяткі тысяч індактрынаваных студэнтаў, мэр Нью-Ёрку Блумбэрг ды паліткарэктныя сродкі масавай інфармацыі.

Час цяпер для амэрыканскай гэбрайскай грамады сапраўды вырашальны. Ці зазірнуць у вочы фактам, ці надалей уважаць за рэальнасьць тое, што хочацца бачыць. Няслушны выбар можа каштаваць гэбрайскай грамадзе ўплыву ды аўтарытэту. Воляй абставінаў зьмяняецца парадыгма грамадзкага жыцьця, праз мяшаныя шлюбы ды брак рэлігійнага выхаваньня колькасьць гэбраяў, што бяруць удзел у грамадзкім жыцьці свае супольнасьці, штогод меншае. Сярод грамадзкіх арганізацыяў зьнік некалі магутны Амэрыканскі Гэбрайскі Кангрэс, занепадаюць паціху Бнай Брыт, Сіяніцкая Арганізацыя Амэрыкі, жаночая сіяніцкая арганізацыя Гадаса, Амэрыканскі Гэбрайскі Камітэт. Самы моцная на сёньня структура Гэбрайская Сусьветная Служба скіроўвае свае намаганьні й фінансы пераважна на бедакоў Трэцяга сьвету. Усё менш структураў ажыцьцяўляюць маніторынг антысэмітызму, і гэта ў час, калі антысэмітызм пад маркаю антысіянізму робіцца што мацнейшы на ўнівэрсытэцкіх кампусах.

Але цяперашняе выпрабаваньне далёка ня першае ў амаль 500-гадовай гісторыі гэбраяў Амэрыкі, і гэта дае надзею, што яны з гонарам пройдуць яго.

Віталь ЗАЙКА

Узнаўляемыя крыніцы энэргіі

Заканчэньне з бачыны 6

2. Беларусь валодае вялікім патэнцыялам узнаўляемых крыніцаў энэргіі, які амаль у два разы перавышае спажываньне электраэнэргіі ў краіне, што дазваляе ўжо ў хуткім часе істотна скараціць аб'ёмы выкарыстаньня вуглевадароднага паліва, імпартуемага з Расеі, а ў пэрспэктыве, з пасьпяховым разьвіцьцём ветраэнэргетыкі і сонечнай энэргетыкі, поўнасьцю вырашыць усе праблемы надзейнага і невычарпальнага энэргазабесьпячэньня.

3. Пры існуючым узроўні тэхналягічнага разьвіцьця і кан'юнктуры, якая склалася на сусьветных энэргетычных рынках, відавочныя перавагі ўзнаўляемых крыніц энэргіі пакуль не могуць пераважыць добра адпрацаваныя, простыя і таньнейшыя мэтады атрыманьня энэргіі з традыцыйнага вуглевадароднага паліва. Таму ўрады многіх краінаў распрацоўваюць сыстэмы стымулаў і гарантый, якія забясьпечваюць належныя ўмовы для разьвіцьця ўзнаўляемых крыніцаў энэргіі.

4. Узнаўляемыя крыніцы энэргіі – гэта ня толькі альтэрнатыва АЭС і энэргетыцы, заснаванай на выкарыстаньні вуглевадароднага паліва (газ, нафтапрадукты і інш.), але, перш за ўсё, гэта гарантыя надзейнага і невычарпальнага энэргазабесьпячэньня, асноўны накірунак умацаваньня эканамічнай, энэргетычнай, экалягічнай і палітычнай бясьпекі.

5. Атамная энэргетыка з-за вялікай рызыкі аварый зь цяжкімі наступствамі, з-за абмежаванасьці ядзернага паліва, з-за невырашальнасьці праблемы бясьпечнага захоўваньня (утылізацыі) ядзерных адкідаў ды іншых нэгатыўных фактараў ня мае ніякіх пэрспэктываў. Ужо ў хуткім часе ад яе сапраўды застануцца толькі непрыемныя ўспаміны.

6. Акрамя ўзнаўляемых крыніцаў энэргіі ў людзей няма іншай альтэрнатывы надзейнага і невычарпальнага энэргазабесьпячэньня.

7. Галоўнай прычынай нізкага ўзроўню разьвіцьця ў Беларусі ўзнаўляемых крыніцаў энэргіі зьяўляецца, на маю думку, празьмерна вялікая зацікаўленасьць Расеі ў экспарце ў нашую краіну сваіх паліўна-энэргетычных рэсурсаў, якую яна пасьпяхова рэалізуе пры "паслухмянасьці" кіруючага антыбеларускага рэжыму.

8. Яшчэ дзьве вельмі істотныя прычыны, – адсутнасьць эфэктыўнай дзяржаўнай падтрымкі разьвіцьця ЎКЭ і "непрафэсійная" праца органаў дзяржаўнага кіраваньня з замежнымі інвэстарамі ёсьць вытворныя ад галоўнай прычыны.

Сьнежань 2012 г.

Мікалай Крыжаноўскі,

дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га скліканьня, сябра дэпутацкай Апазіцыі БНФ

ЗАЯВА

Апошнім часам ад сяброў нашай арганізацыі паступаюць зьвесткі ды пытаньні адносна дзейнасьці сп. Мікалая Цімашэнкі, які займаецца справамі, зьвязанымі са зьменаю іміграцыйнага статусу ў ЗША.

Управа Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня" лічыць неабходным паінфармаваць, што **сп. Мікалай Цімашэнка** не зьяўляецца сябрам Згуртаваньня "Пагоня", і ні ў які спосаб не зьвязаны зь ім. Адпаведна, ён ня мае правоў або паўнамоцтваў прадстаўляць Згуртаваньне "Пагоня" ці выступаць ад ягонага імя.

Шаноўныя сябры!

*Разам з гэтым нумарам "Вестак і Паведамленьняў" кожны падпісчык атрымае ад рэдакцыі калядны падарунак – **каляндар на 2013 год**. Няхай ён дапамагае вам адлічваць шчасьлівыя дні Новага году і нагадвае, што ўсё нашыя дасягненьні й посьпехі сталіся магчымымі толькі дзякуючы нашым агульным высілкам, зацікаўленасьці і ахвярнасьці.*

Не забывайце, калі ласка, працягнуць падпіску на бюлетэнь, калі яна ў Вас канчаецца. Інфармацыю пра тэрмін сканчэньня вашай падпіскі можна знайсьці на адраснай налепцы.

Уплаты ў Згуртаваньне
Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíí³:

К. Баранава **50**
В. Вікторчык **50**
Ю. Малахаў **50**
Т. Мароз **50**
А. Мясьнікоў **50**
В. Петрушэнка **50**
К. Проніна **50**
К. Яўсейчык **50**

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя
Valentina Balashchenko.

*Паважаныя **Аліса Ксяневіч, Аляксей Петрусевіч, Максім Пульманоўскі,** калі ласка, паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "ПАГОНЯ" адбудзецца **ў суботу 12-га студзеня 2013 году.**

Месца правядзеньня сходу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі **Union Square**.*

Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.

Заля на другім паверсе.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

----

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў, ладжаных арганізацыяй, можна даведацца, наведаўшы ў інтэрнэце ўэбстаронку **www.baza-belarus.org***

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні* :

К. Баранава **30**
В. Вікторчык **30**
А. Мясьнікоў **30**
В. Петрушэнка **30**
К. Проніна **30**
Г. Пятрова **30**
К. Яўсейчык **30**

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*

VIESTKI
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі з адзнакаю **"Весткі"** выпісвайце на імя **Valentina Balashchenko**.*

*Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы сайт **www.e-krama.com***

Рэдакцыя бясплатна надрукуе прыватныя абвесткі і будзе ўдзячная за дасланыя артыкулы, водгукі й лісты.